# РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

***Лапіцкая Д.В.,***
*студэнтка 4 курса БрДУ імя А.С. Пушкіна, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Канцавая Г.М., канд. філал. навук, дацэнт

Маўленне адыгрывае важную ролю ў станаўленні асобы дзіцяці, з'яўляючыся найважнейшым сродкам зносін, пазнання навакольнай рэчаіснасці. Развіць звязнае маўленне – гэта асноўная мэта пачатковай школы, паколькі без яго асваення не можа адбывацца сацыялізацыя дзіцяці ў грамадстве. Любое маўленне нельга развіваць толькі па падручніках, да гэтага працэсу абавязкова павінны быць падключаны эмоцыі і захопленасць, бо недастаткова проста завучыць словы і шаблонныя фразы, важна навучыцца дакладна іх выкарыстоўваць у маўленні.

Мэта працы – апісаць найбольш эфектыўныя заданні, якія спрыяюць развіццю маўлення вучняў пачатковых класаў на ўроках літаратурнага чытання.

**Матэрыял і метады.** У нашым даследаванні выкарыстоўваецца літаратура па праблеме развіцця маўлення малодшых школьнікаў на ўроках літаратурнага чытання**.** Выкарыстаны метады аналізу, сістэматызацыі і абагульнення.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Развіццё маўлення – актуальная задача навучання, так як наша маўленне з'яўляецца асновай усякай разумовай дзейнасці і сродкам чалавечых зносін (камунікацыі).

На ўроках літаратурнага чытання фарміруюцца ўменні ўвасабляць у слове прадукты фантазіі і творчасці вучняў, выкарыстоўваць у маўленні вобразныя сродкі мовы (параўнанні, эпітэты, метафары, увасабленні) і сродкі вуснага слоўнага апісання прадмета. На ўроках праводзіцца праца па ўзбагачэнні і актывізацыі слоўніка, развіцці ўяўлення, мыслення і іншых псіхічных працэсаў.

Вылучым групы практыкаванняў, праца з якімі спрыяе развіццю маўлення вучняў пачатковых класаў.

Першая група практыкаванняў накіравана на развіццё ў вучняў здольнасці эмацыянальна адгукацца на прачытанае. Для паўнавартаснага ўспрымання твора малодшым школьнікам неабходна пранікнуцца эмацыянальным станам героя, адчуць і перажыць тое, што яго хвалюе, здзіўляе, радуе. Гэта цяжка для малодшых школьнікаў, так як іх эмоцыі развіты недастаткова, вучні не гатовыя ў поўнай меры суперажываць і спачуваць прачытанаму. Вельмі шмат разумовых намаганняў ім даводзіцца затрачваць на сам працэс чытання, а гэта значна ўплывае на эмацыянальны складнік.

Для ўзмацнення эмацыянальнага ўспрымання можна прапанаваць наступныя заданні: Якія пачуцці пры чытанні верша ўзніклі ў вас: здзіўленне, радасць, захапленне, шкадаванне? Звярніце ўвагу на словы, якія выбірае аўтар для перадачы сваёй радасці ад убачанага; Знайдзіце ў вершы словы, якія перадаюць настрой аўтара; Прыдумайце (падбярыце) мелодыю да гэтага верша.

Другая група практыкаванняў накіравана на абуджэнне ўяўлення і фантазіі малодшых школьнікаў (слоўнае маляванне). Можна прапанаваць такія заданні: Уявіце сабе, што вам трэба намаляваць карціну да тэксту. Падумайце, якія фарбы вы выкарыстаеце, каб намаляваць неба, аблокі, зеляніну, зямлю і г. д. Услухайцеся ў гучанне верша і паспрабуйце наспяваць мелодыю, якая падыходзіць па гучанні да гэтага верша. Якія гукі паўтараюцца ў радку і што яны "малююць"? Падбярыце слоўную ілюстрацыю да ўсяго верша або да абранага вамі ўрыўка. Якія радкі верша падыходзяць да вашай ілюстрацыі?

Трэцяя група практыкаванняў накіравана на дэталізацыю і канкрэтызацыю ўяўленняў аб эпітэтах, параўнанні, увасабленні, метафары. Праца над вобразнай мовай

лірычнага верша вельмі важная, бо яна спрыяе развіццю маўлення і ўзбагачэнню слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў, дапамагае ўдумацца ў сэнсавы змест лірычнага твора, набліжае вучняў да творчага працэсу. Можна прапанаваць такія заданні: Падбярыце свае эпітэты да прапанаванага слова і параўнайце з аўтарскімі; Ці зменіцца вершаваны вобраз, калі вы заменіце эпітэт, параўнанне, увасабленне, метафару? Знайдзіце ў тэксце верша вобразныя сродкі мовы: эпітэт, параўнанне, увасабленне, метафару. Знайдзіце эпітэт і слова, якое ён характарызуе.

Чацвёртая група практыкаванняў накіравана на выражэнне асобасных адносін: Які настрой аўтара вы адчулі? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі пра пачутае; Які пачуцці ў вас ўзніклі? Раскажыце пра свае адносіны да ўяўнай карціны.

Пакажам прыёмы працы з вершам Я. Коласа «Зіма» [2, с. 84–85]. Можна прапанаваць наступныя заданні: Прачытайце самыя прыгожыя словазлучэнні (мяккая пярына, белая раўніна, пад плёнкай белай, лес з доўгімі вусамі). Якія радкі запомніліся? Прачытайце іх без падручніка. Знайдзіце ўвасабленне (лес апусціў галіны, рэчка анямела, змоўклі ручаёчкі); Прачытайце толькі тыя радкі, якія адносяцца да ілюстрацыі; Уявіце сабе, што вам трэба намаляваць карціну да гэтага тэксту. Падумайце, якія фарбы вы выкарыстаеце?

**Заключэнне.** Такім чынам, разнастайныя прыёмы, якія падахвочваюць вучняў да вербальнай камунікацыі, садзейнічаюць выпрацоўцы неабходных навыкаў зносін, фарміраванню ўпэўненасці, выхаванню павагі да пачуццяў і перажыванняў іншага чалавека, развіццю звязнага маўлення малодшых школьнікаў. Паступова набываецца пазітыўны камунікатыўны вопыт, адбываецца маральнае развіццё асобы.

1. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне: вучэб. дапам. для 3 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. Ч. 1 / М. В. Жуковіч. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2017. – 136 с.

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ МНЕМОТЕХНИЧЕСКИХ ПРИЕМОВ НА УРОКАХ ИНОСТРАННОГО ЯЗЫКА

***Латышева М.С.,***
*студентка 4 курса Оршанского колледжа ВГУ имени П.М. Машерова, г. Орша, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Мануйленко Л.Н., преподаватель

Изучение любого иностранного языка подразумевает под собой необходимость запоминания большого объёма иностранных слов, а слова с неизвестным, порой абстрактным значением трудно запомнить большинству учащихся. Исследования в данном направлении показали, что если такое слово заучить, то оно исчезает из памяти через несколько дней [3]. Существует решение данной проблемы в виде различных приемов запоминания, в частности приемов мнемотехники.

Исследованием данной проблемы занимались следующие ученые и выдающиеся люди: Джордано Бруно, А.Н. Леонтьев, Л.С. Выготский. Разные мнемотехники использовали легендарные исторические личности: Юлий Цезарь, Теодор Рузвельт, Никола Тесла. Целый ряд исследований следующих психологов посвящены изучению приемов мнемотехники: Ф.Ч. Бартлетт, Г. Эббингауз, В. А. Козаренко, П.И. Зинченко, С.П. Бочарова [3]. Однако глубокого исследования об использовании приемов мнемотехники на уроках иностранного языка проведено не было.

Цель нашего исследования – анализ эффективности использования мнемотехнических приемов для запоминания информации на уроке иностранного (английского) языка и влияние данных приемов на увеличение объема кратковременной памяти учащихся.